БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ
WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")
Authorized by EUCOM Hqs Civil Affairs Division, 1. January 1951, Nr. UNDP 225
Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK
Printing Office: Buchdruckerei der Apostolischen Visitatur, München 8, Rosenheimer Straße 46a. — Telefon-Nr. 45 81 48
Circulation: 3500 copies. Sponser: IRO
Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA“ München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ДВА ТЫДНІ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“ | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“

№ 72 | 15 кастрычніка 1951 | ГОД ВЫДАНЬНЯ 5

Незалежнасьць, фэдэрацыя і народнае галасаваньне

Да нацыянальнай праграмы Савету Вызваленьня Народаў Расеі

Жывём у эпоху дэмакратызму, калі правы ўсіх народаў на іхнае вольнае й незалежнае жыцьцё зьяўляюцца загарантаванымі міжнароднымі законамі. Пастановы Атлянтычнай Карты й іншых міжнародных дэклярацыяў гавораць аб гэтым ясна й нядвузначна. У духу дэмакратычных ідэяў рэалізуюцца сяньня гэтыя правы ў дачыненьні да ўсіх тых, яшчэ нядаўна паняволеных народаў, што не знаходзяцца пад акупацыяй таталітарнага Савецкага Саюзу. На пяці шостых частках сьвету, якіх не дасягае камуністычная дыктатура, паняцьці паняволеньня народаў, вынарадаўляньня слабейшых народаў сільнейшымі, абмежаваньні ці адмаўляньні нацыянальных і палітычных правоў адных народаў другімі страцілі ўжо на сваей актуальнасьці й перайшлі да гісторыі, як памятка няслаўнага мінулага.

Гэтак, прыкладам, Ангельшчына — найбольш клясычная імпэрыя мінулых часоў, — якая ўладала цэлым радам народаў даслоўна ўсіх частак сьвету, была змушаная згадзіцца з фактам, калі гэтыя народы ськівулі зь сябе ўсякую ангельскую залежнасьць і абвесьцілі свае незалежныя гаспадарствы. Падобна паступілі ЗША ў дачыненьні да Філіпінаў, Галяндыя ў дачыненьні да Індазнэзіі, й г. п. На колькі гуманным і справядлівым было разьвязаньне нацыянальнага пытаньня ўспомненымі дэмакратычнымі гаспадарствамі вымоўна сьветчыць факт, што нядаўна паняволеныя імі народы не зьяўляюцца сяньня іхнымі ворагамі, але шчырымі прыяцелямі й палітычнымі саюзнікамі. Такім чынам права кажнага народу самому пастанаўляць аб сваім собскім лёсе, права на ягоную гаспадарстваўскую незалежнасьць зьяўляецца сяньня агульным і незапярэчным. Гэтае права прыслугоўвае бяз выключэньня ўсім народам сьвету, яно прыслугоўвае й народам, паняволеным бальшавіцкай Расеяй, а ў тым ліку й нам, беларусам.

Побач з гэтым, умовы міжнародных узаемадачыненьняў апошняга часу зрадзілі канечную патрэбу дабравольнага задзіночваньня паасобных народаў і гаспадарстваў у больш або менш цесныя міжгаспадарстваўскія блёкі коштам часьці іхнага сувэрэнітэту. Такога задзіночаньня вымагаюць патрэбы палітычныя, культурныя, эканамічныя, а перадусім абаронна-стратэгічныя. Паколькі ўсе гэтыя галіны людзкага жыцьця зьяўляюцца сяньня неабмежаванымі ў сваім засягу й разьвіваюцца ў сусьветным маштабе, патолькі, рэч зразумелая, ня могуць яны быць паўстрымоўванымі й зьвязванымі штучна створанымі гаспадарстваўскімі межамі. Гэтак паўсталі й зактуалізаваліся канцэпцыі фэдэрацыйныя. Міжнародныя ўзаемадачыненьні прыносяць не адзін прыклад насьпяваньня й рэалізацыі гэтых фэдэрацыйных канцэпцыяў, пачынаючы ад розных абаронных пактаў, а канчаючы на канцэпцыі задзіночаных штатаў Эўропы. Апошняя канцэпцыя ўжо выйшла із сфэры ідэі й тэарэтычных разважаньняў, а ўвайшла ў стадыю практычнага ажыцьцяўленьня. Найлепшымі гэтага доказамі можа быць эканамічны плян Шумана й ваенны плян Плевэна, на аснове якога творыцца эўрапэйская армія.

Аснаўны кірунак далейшага разьвіцьця людзкасьці гаворыць за тым, што фэдэрацыйныя канцэпцыі будуць усьцяж узмацняцца, што сужыцьцё народаў і гаспадарстваў будзе вымагаць што раз цясьнейшага супрацоўніцтва й вымены як матарыяльных, гэтак і духовых дасягненьняў паміж паасобнымі народамі.

Але адна канцэпцыя — незалежнасьці зусім ня выключае другой — фэдэрацыі. Ня выключае таму, што фэдэрацыя ў дэмакратычных умовах жыцьця апіраецца на прынцыпе дабравольнасьці. Апрача гэтага, калі адно сфэдэраванае гаспадарства траціць частку свайго сувэрэнітэту на карысьць агульна-фэдэрацыйнай канструкцыі, дык такую-ж самую частку сувэрэнітэту і ў той-жа самай меры траціць кажнае гаспадарства, што зьяўляецца ўдзельнікам фэдэрацыі.

Мы беларусы, якія імкнёмся ў будучыні пасьля зьнішчэньня бальшавізму аднавіць собскае незалежнае гаспадарства, мусім ужо сяньня лічыцца з тым, што будучая незалежная Беларусь будзе толькі часткай вялікшае фэдэрацыйнае канструкцыі, будзе гаспадарствам сфэдэраваным. Тут мы ня будзем разводзіцца над тым, зь якімі народамі практычна найвыгадней быць нам сфэдэраванымі, а разглядаем гэтую праблему ў плашчыні тэарэтычнай.

У сьвятле гэтых разважаньняў прыгледзімся цяпер, як думае разьвязаць нацыянальнае пытаньне на прасторы, абнятым сяньня Савецкім Саюзам, нядаўна створаны Керэнскім г. зв. Савет Вызваленьня Народаў Расеі. Гэтае пытаньне зьяўляецца асабліва важным і актуальным у сувязі з тым, што Савет мае выступаць ня толькі ад імені расейскага народу, але й усіх паняволеных бальшавізмам нерасейскіх народаў, і што ініцыятары й закладчыкі Савету — расейскія палітычныя арганізацыі ўжо зьвяртаюцца да палітычных прадстаўніцтваў нерасейскіх народаў з прапановамі іхнага ўваходу ў Савет.

Ня будзем тутака спыняцца над усімі пунктамі нацыянальнае праграмы расейцаў, бо гэта ўжо мы зрабілі ў артыкуле «Што нам суляць расейцы», надрукаваным у 68 нумары «Бацькаўшчыны»; спынімся тут толькі над пытаньнем, якое непасрэдна вяжыцца з тэмаю нашага артыкулу. Вось-жа аснаўным пунктам гэтае праграмы ёсьць асьветчаньне, што Савет паддзержывае канцэпцыю захаваньня адзінства расейскае імпэрыі ў граніцах 1939 г., у якой усе народы былі-б сфэдэраваныя й цешыліся-б роўнымі нацыянальнымі правамі. Адначасна Савет дапускае поўнае самавызначэньне нерасейскіх народаў і выхад іх з агульнарасейскае фэдэрацыі, аб чым, аднак, павінна задэцыдаваць свабоднае волявыяўленьне народаў шляхам агульнага галасаваньня — плебісцыту.

Ня будзем тут таксама спыняцца над справай граніцаў 1939 г. і плянаў новага падзелу Беларусі й Украіны, бо да гэтага пытаньня вернемся іншым разам. Разгледзім толькі пытаньне, ці такая пастаноўка спарвы (агульнанароднае галасаваньне) адказвае вышэйазначаным дэмакратычным прынцыпам у разьвязаньні нацыянальных праблемаў сучаснае эпохі і ці яна заспакайвае нацыянальныя патрэбы й інтарэсы ўсіх народаў, ці наадварот, хавае яна ў сабе тэндэнцыі, з гэтымі прынцыпамі супярэчныя? Вось-жа калі глыбей прааналізуем гэтае пытаньне, дык пераканаемся, што адказ можа быць толькі нэгатыўны.

Ніводзін зь нерасейскіх народаў, што імкнуцца да адбудовы собскае нацыянальнае незалежнасьці, дабравольна да Расеі не далучыўся. Усе яны былі сілаю падбітыя расейскімі царамі, а потым,

(Заканчэньне на 3 балоне)

БЛІЗКІ УСХОД БУНТУЕЦЦА

Вялікабрытанія, якая некалькі дзесяткаў год таму назад была наймагутнейшай у цэлым сьвеце імпэрыяй і пры амэрыканскім ізаляцыянізьме адыгрывала найвялікшую сусьветную ролю, паступова, але сыстэматычна траціць сваё значэньне ў сьвеце. Пасьля поўнага ўнезалежненьня ад Лёндану цэлага раду ягоных дамініяў і калёніяў, межы імпэрыі агранічыліся да Брытанскіх астравоў, а сыстэма брытанскага «камэнвэльту» сталася паняцьцем чыста фармальным.

Апошнім часам Ангельшчына сталася аб'ектам новага цяжкага ўдару, які моцна падважыў як ейныя інтарэсы на Блізкім Усходзе, гэтак і ейнае значэньне ў цэлым сьвеце.

ЗМАГАНЬНЕ ЗА ІРАНСКУЮ НАФТУ

Англа-іранскі канфлікт у справе эксплятацыі й прадажы ангельцамі іранскае нафты дайшоў да кульмінацыйнага пункту. Калі Ангельшчына адкінула апошнюю ноту Ірану аб узнаўленьні перагавораў у справе нафты, матывуючы гэта тым, што нота ніякіх новых праектаў для разьвязаньня канфлікту ня ўносіць, пэрсыдзкі ўрад выдаў загад аб эвакуацыі да 4 кастрычніка ангельскага тэхнічнага пэрсаналу, працуючага на пэрсыдзкіх нафтовых рафінэрыях. Ня гледзячы на пастанову Гааскага Міжнароднага Трыбуналу, пагрозы Ангельшчыны збройна бараніць сваіх правоў, як і мэдыятарскія спробы ЗША, іранскі ўрад, а галоўна прэм'ер міністраў Могамэд Мосадэк аказаліся станоўкімі й бескампрамісовымі. У сувазі з гэтым Ангельшчына яшчэ перад уплывам вызначанага тэрміну забрала свой тэхнічны пэрсанал у колькасьці звыш 300 асоб з Пэрсыі й справу гэтую перадала на вырашэньне Рады Бясьпечнасьці, якая й сабралася 1-га кастрычніка. Далейшыя паседжаньні Рады былі адложаныя ў сувазі зь няпрысутнасьцю шэфа іранскае дэлегацыі прэм'ера Мосадэка, які прыбыў у Нью-Ёрк толькі 8 кастрычніка, і хваробай апошняга, спачатку да 11, а потым да 15 кастрычніка.

Ангельшчына матывавала сваю заяву ў Радзе Бясьпечнасьці тым, што становішча Ірану ў нафтавым споры загражае сусьветнаму міру й міжнароднай бясьпечнасьці. Іранская дэлегацыя ўвесь час станоўка трымаецца пагляду, што справа іранскае нафты ёсьць нутраной справай Ірану, у які ані Рада Бясьпечнасьці, ані які-небудзь іншы міжнародны орган умешвацца ня мае права. Што болей, іранская дэлегацыя папярэдзіла, што яна дэманстрацыйна пакіне паседжаньне й будзе байкатаваць пастанову Рады ў выпадку, калі ейная пастанова будзе вынесеная ў духу ангельскіх дамаганьняў. Такое становішча іранскага ўраду падтрымліваюць дзьве дэлегацыі Рады Бясьпечнасьці — Савецкі Саюз і Югаславія, тады калі 9 іншых дэлегацыяў трымаюцца ангельскага пункту гледжаньня.

Вялікабрытанія ў сваей заяве дамагаецца, каб Рада Бясьпечнасьці змусіла Іран адклікаць загад аб высяленьні тэхнічнага ангельскага пэрсаналу й рэспэктаваць пастанову Міжнароднага Трыбуналу ў Гаазе з 5 ліпеня, паводля якой абедзьве староны былі закліканыя ня ўводзіць ніякіх канчальных мерапрыемстваў, якія маглі-б прывесьці да завастрэньня сытуацыі. Як Ангельшчына, гэтак і ЗША паважна лічацца з магчымасьцю вэта савецкай дэлегацыі ў выпадку, калі-б Рада Бясьпечнасьці заспакоіла ангельскія дамаганьні.

Амэрыканская дэлегацыя ў Радзе Бясьпечнасьці робіць усьцяж намаганьні з мэтаю кампрамісовага палагоджаньня справы. Відаць пад ейным уплывам, ангельская дэлегацыя апошнімі днямі значна злагодзіла свае дамаганьні. Яна не настойвае ўжо на тым, каб Рада асудзіла паступак Ірану, але дамагаецца толькі ейнага ўплыву дзеля ўзнаўленьня непасрэдных перагавораў. Заступнік іранскага прэм'ера Гусэйн Фатэмі у вадказ на гэта паведаміў, што Іран згаджаецца распачаць новыя перагаворы, калі трэйцяе гаспадарства згодзіцца ўзяць на сябе ролю пасярэдніка.

ВОРОЖЫ КРОК ЭГІПТУ

Пагроза Эгіпту, што ім будзе анулявакы англа-эгіпскі трактат з 1936 г. аб бясьпечнасьці Суэцкага Каналу, як і дагавор з 1899 г. аб супольнай англа-эгіпскай адміністрацыі Судану, 8 кастрычніка ўвайшла ў стадыю свайго ажыцьцяўленьня. У гэты дзень эгіпскі ўрад перарваў ведзеныя ў гэтай справе перагаворы зь Лёндынам і эгіпскі прэм'ер-міністраў унёс у парлямант чатыры рэзалюцыі, у якіх дамагаецца вываду ангельскага гарнізону з тэрыторыі Суэцкага Каналу й прылучэньня Судану да Эгіпту.

Афіцыяльныя колы Эгіпту заяўляюць, што пасьля ратыфікацыі парлямантам анулязаньня англа-эгіпскіх дагавораў, якая мае наступіць 15 кастрычніка, ангельскія войскі ў зоне Суэцкага Каналу будуць уважацца за «варожыя збройныя сілы». У Лёндане афіцыяльна падчырківаецца, што Вялікабрытанія зьяўляецца здэцыдаванай навет збройна бараніць сваё становішча ў зоне Суэцкага Каналу й у Судане.

ІРАК ТАКСАМА БУНТУЕЦЦА

Апошнімі днямі ўрад Іраку пастанавіў зрэвідаваць англа-іранскі дагавор, заключаны ў 1930 г. на 25 гадоў. Паводля гэтага трактату Вялікабрытанія мела права зарганізаваць свае лётніцкія абаронныя пункты ў Габоніі й Шайбе й у ваколіцах гэтых пунктаў трымаць свае ваўсковыя гарнізоны. Варта пры гэтым адцеміць, што лётніцкі абаронны пункт у Габоніі ператварыўся апошнім часам у найвялікшую лётніцкую ваенную базу Сярэдняга Усходу, а стацыянуючы там ваенны гарнізон бы[illegible] апошнія месяцы значна ўзмоцнены.

* * *

Апошнія няўдачы Ангельшчыны на Блізкім Усходзе зьяўляюцца на руку для Савецкага Саюзу, які ўсюды там, дзе толькі магчыма, стараецца бараніць становішча ўсходніх краінаў, як і праз свае пятыя калоны падтрымліваць у іх антыангельскія настроі. Аднак аснаўныя прычыны антыангельскіх выступленьняў на Блізкім Усходзе хаваюцца ў чымсьці іншым. Яны выплываюць зь незадаваленьня арабскага сьвету з палітыкі заходніх гаспадарстваў, эканамічнага выкарыстойваньня іх Ангельшчынай, як і з нацыянальных пачуцьцяў арабскіх народных масаў. Антыангельскія мерапрыемствы Ірану й Эгіпту былі ў вялікай меры зробленыя пад прэсыяй насельніцтва гэтых краінаў, якое праводзіць масавыя дэманстрацыі супраць Ангельшчыны, катэгарычна дамагаючыся няўмешваньня апошняй у іхныя нутраныя дачыненьні. На колькі насельніцтва гэтых краінаў зьяўляецца задзіночаным і скансалідаваным у сваей антыангельскай акцыі, можа сьветчыць факт, што ўрадавыя апазыцыі як у Іране, гэтак і Эгіпце поўнасьцю салідарызуюцца з урадамі ў антыангельскіх мерапрыемствах.

Але палітыка Ірану й Эгіпту б'е ня толькі па Ангельшчыне. Яна ў ня меншай меры зьяўляецца ськіваванай супраць інтарэсаў усяго Захаду й ягоных абаронных плянаў на Блізкім Усходзе й міжземнаморскім прасторы, становячыся такім чынам праблемай міжнароднай. Таму Захад асабліва зацікаўлены ў палюбоўным палагоджаньні гэтых канфліктаў і шукае кампрамісовага выхаду. Гэтак у дачыненьні да Эгіпту зактуалізаваўся апошнім часам плян заснаваньня абароннага пакту Блізкга Усходу, у які, як раўнапраўны сябра, увайшоў-бы й Эгіпт. Тады ў зоне Суэцкага Каналу стацыянавалі-б ужо ня выключна ангельскія войскі, але міжнародныя збройныя сілы, у тым ліку эгіпскія й ангельскія. Што тычыцца Ірану, варта адцеміць новы праект, які унёс былы міністар фінансаў ЗША Моргэнтаў. Згодна гэтага праекту Задзіночаныя Нацыі павінны адкупіць акцыі Англа-Іранскага Нафтовага Товарыства, падпарадкаваўшы яго такім спосабам міжнароднай кантролі.

Чым уся гэта справа закончыцца, пакажа недалёкая будучыня. На сяньня аднак зьяўляецца яна нязвычайна балючым ударам для Ангельшчыны й вялікай перашкодай для гаспадарстваў Атлянтычнага пакту ў іхнай абароннай акцыі.

(-іч)

БЕЛАРУСЬ НЕПЕРАМОЖНАЯ

Чырвоная Масква з мэтаю поўнае русыфікацыі беларускага народу й павялічэньня за ягоны кошт нацыянальнага патэнцыялу расейскага ўжо на працягу звыш трыццаці год сыстэматычна вынішчае ўвесь нацыянальна творчы, актыўны й сьведамы беларускі элемэнт. За ўвесь гэты пэрыяд часу дзесяткі й сотні тысячаў беларускае перадавое інтэлігенцыі й нацыянальнага актыву было арыштавана, расстраляна або выслана ў канцэнтрацыйныя лягеры на павольнае кананьне. Гэткі-ж самы лёс падзяліла таксама некалькі мільёнаў беларускага перадавога й найбольш нацыянальна актыўнага сялянства.

У выніку няведамай яшчэ ў гісторыі вынішчальнай палітыкі чырвонага Крамля сяньня касьцьмі беларусаў усееная ўся адна шостая часьць сьвету ад Сахаліна й Калымы на Далёкім Усходзе, Котласа, Салавецкіх астравоў і Беламорканалу ў палярнай поўначы да Казахстанскіх пустыняў на паўдні. На бязьмежнай тэрыторыі Савецкага Саюзу ўва ўсіх канцэнтрацыйных лягерах прымусовае працы, як і на ўсіх «вялікіх пабудовах камунізму» мучаюцца сотні тысячаў беларусаў, будучы адарванымі ад роднае землі й асуджанымі на павольную сьмерць толькі за тое, што яны хацелі быць беларусамі.

Арышты, ссылкі й расстрэлы ў Савецкім Саюзе ня спыняюцца ніколі. Крывавыя расправы над беларускім народам адбываюцца сыстэматычна, яны сталіся звычайным штодзенным зьявішчам. Цьверджаньні, што ў Б[illegible]арусі бадай няма ніводнай такой [illegible] зь якой нехта ня быў-бы арыштаваны, высланы ці растрэлены, не зьяўляюцца ніякім пераўвялічэньнем, але ілюструюць жахлівую запраўднасьць. Але побач із сталым і бесьперапынным нішчэньнем беларускага народу, у Саветах ад часу да часу адбываецца масавая вынішчальная акцыя, званая генэральнымі чысткамі, калі ахвярамі чырвонага тэрору падаюць сотні тысячаў, а навет мільёны ў нічым нявінаватых людзей. Да гэтага часу на Беларусі ўжо пракацілася аж пяць хваляў такіх масавых чыстак, у выніку якіх найбольш нацыянальна творчы й сьвядомы беларускі элемэнт быў бясьсьледна зьнішчаны.

Пралёгам да такіх чыстак можна ўважаць ведамы працэс Лістападаўцаў у 1926 г., у выніку якога было засуджана на доўгія гады, а потым у адміністрацыйным парадку практыкі ГПУ зьнішчана цэлы рад беларускае моладзі Случчыны, якая пад кіраўніцтвам палкага патрыёты Лістапада плянавала падняць беларускі народ на змаганьне за ідэалы 25 Сакавіка. Дзейнасьць Лістападаўцаў выводзілася з традыцыяў Слуцкага Паўстаньня й была фактычна ягоным эпілёгам.

Але першая масавая чыстка ў Беларусі прыпадае толькі на 1929—30 г.г., калі Масква, у імя абнаглелага расейскага вялікадзяржаўніцкага шавінізму, аб'явіла паход супраць найвыдатнейшых прадстаўнікоў беларускае культуры, мастацтва, літаратуры й навукі, як і перадавых грамадзкіх дзеячоў, ведамы пад назваю ліквідацыі нацдэмаўшчыны. Побач із сотнямі іншых слаўных беларусаў, былі тады арыштаваныя й высланыя такія заслужаныя беларускія дзеячы, як праф. Ігнатоўскі, Прышчэпаў, Смоліч, Ластоўскі, Гарэцкі, Краскоўскі, Баліцкі, Дыла, Чарнушэвіч і мноства іншых. У сьлед за гэтай акцыяй, а часткова й адначасна зь ёю адбываецца прымусовая калектывізацыя й ліквідацыя г. зв. кулакоў. Ахвяраю раскулачваньня пала да двух мільёнаў беларускага перадавога, найбольш прадпрыемчывага й нацыянальна сьведамага сялянства.

Наступная масавая чыстка прыпадае на 1933 г. Побач зь беларускімі нацыянал-дэмакратамі, такімі, як паэты Дубоўка, Пушча, Чарот, ды пасламі ў польскі сойм, вымененымі Саветамі, як Тарашкевіч, Дварчанін, Мятла, Рак-Міхайлоўскі й іншыя, гэтая чыстка галоўным чынам закранула беларускіх партыйцаў. Гэта былі тыя беларусы, што, зьяўляючыся перакананымі камуністымі, стараліся пагадзіць ідэі камунізму з нацыянальнымі патрэбамі беларускага народу. На працягу некалькіх месяцаў зьніклі

(Заканчэньне на бал. 4)

ШУКАЕМ РАЗЬВЯЗКІ

(Працяг, глядзі № 71)

Надыходзіць 1941 г. Выбухае вайна. Ізноў надзея ўступае ў сэрцы беларускай інтэлігенцыі й беларускіх сялянскіх масаў. Паміма дванаццацігадовага нацыянальнага тэрору, паміма масавага вынішчэньня беларускага нацыянальнага актыву, бальшавікі ня здолелі забіць беларускага нацыяналізму, карэньні якога, як гэта паказалася ў практыцы, ня былі ў групцы інтэлігенцыі, а глыбака сядзелі ў масах беларускага сялянства, зь якога выйшла кіруючая інтэлігенцыя. Карэньні гэтыя сягалі ў далёкую мінуўшчыну Вялікага Княства Літоўскага, гэраічнага змаганьня Кастуся Каліноўскага, яны чэрпалі пажыву із сьвежага яшчэ ў памяці Усебеларускага Кангрэсу, які ажыцьцявіў адвечнае імкненьне беларускага народу. Калі-б праўдзівым было цьверджаньне бальшыні расейскіх палітычных колаў, што беларускі нацыянальны рух праваекуецца й утрымоўваецца групкай сэпаратыстычна настроенай інтэлігенцыі, то ўжо ў 1941 г. беларускае нацыянальнае пытаньне не існавала-б. Тымчасам пасьля прыходу немцаў спантанічна падыймаюцца сялянскія масы, арганізуюцца мясцовыя ўправы, арганізуецца школьніцтва, беларуская адміністрацыя. Беларускі народ верыў, што немцы разьвяжуць нашую нацыянальную праблему паводля нашых справядлівых дамаганьняў.

Немцы аднак не пачулі або не хацелі пачуць гэтага народнага голасу. Мэтай іхнай было стварэньне эўрапэйскіх калёніяў. Апіраючыся на хвальшывых і тэндэнцыйных інфармацыях расейскіх дарадчыкаў, яны ня верылі ў сілу беларускага нацыянальнага руху й лічылі, што хопіць толькі пустых абяцаньняў на будучыню, каб задаволіць нацыянальныя патрэбы й прыцягнуць беларускія масы да супрацоўніцтва.

Немцы робяць першую памылку: прылучаюць вялікую частку беларускае тэрыторыі да Нямеччыны. Пратэст Захаркі, тагачаснага прэзыдэнта БНР, астаецца бяз водгуку ў нямецкіх кіруючых колах, але ён знаходзіць водгук у беларускіх масах. Зароджваецца нелегальны антынямецкі рух, паўстаюць нелегальныя арганізацыі, партыі, прыкладам Беларуская Незалежніцкая Партыя, заснаваная у Менску 7 ліпеня 1942 г. Кіраўніцтва яе ўваходзіць у кантакт зь інж. Абрамчыкам, які беспасярэдна супрацоўнічае з Захаркам. Пачынаецца [illegible]йшая антынямецкая акцыя. Зар[illegible]аецца беларускі партызанскі рух. Немцы аднак, ня гледзячы на разумныя галасы фон Браўхніча, барона фон Энгельгарта, высокага ўрадаўца ў Усходнім Міністэрстве, ды іншых, што дамагаліся стварэньня незалежных гаспадарстваў на Усходзе Эўропы, у тым ліку й Беларусі, астаюцца глухімі на дамаганьні беларускага народу.

Гэта спрытна выкарыстоўваюць бальшавікі. Яны ў сваей прапагандзе ўмела падкрэсьліваюць, якія правы дае беларускаму народу Сталінская канстытуцыя, а што даюць немцы. Параўнаньне, зразумела, выпадае на некарысьць немцаў. Пры гэтым бальшавікі прытарноўваюцца да імкненьняў масаў. Адкрываюць цэрквы, збольшваюць колькасьць прапаганды на беларускай мове ў маскоўскім радыё. Газета «Савецкая Беларусь», якая да вайны была выдаваная на расейскай мове, паяўляецца цяпер на беларускай і ськіваецца з самалётаў на беларускую тэрыторыю. Савецкая прапаганда абяцае падняць БССР да поўнай гаспадарстваўскай годнасьці пасьля заканчэньня вайны. І ўсё гэта дзеля чаго? Каб задаволіць кучку інтэлігенцыі ці каб здабыць беларускія масы, ашуканыя яшчэ раз немцамі? Чаму бальшавікі, ськіваючы з самалётаў сваіх партызанаў, лічылі патрэбным заяўляць ім: «Забудзьцеся цяпер, кім вы былі. З гэтым мамэнтам вы беларускія патрыёты». Хто-ж лепш, як не бальшавікі, ведалі настроі беларускіх масаў і ўмелі выкарыстоўваць іхныя псыхалягічныя мамэнты? Зразумела, што ў вабліччы нямецкай палітычнай тупалобасьці беларускае сялянства павярнула зброю супраць нямецкага акупанта. Беларуская інтэлігенцыя добра разумела небясьпеку такога стану рэчаў, але ня мела аргумэнтаў супраць бальшавіцкай прапаганды.

Немцы напасьледак спасьцярагаюць зробленую імі памылку. Даюць г. зв. Раду Даверу, якая ня мае практычна ніякіх ня толькі гаспадарстваўскіх, але навет і адміністрацыйных прарэгатываў. Ейныя паўнамоцтвы далёкія ад таго, што давала Сталінская канстытуцыя. Зразумела, гэтым сытуацыя не палепшаецца.

Немцы йдуць на далейшыя ўступкі — паклікаюць Беларускую Цэнтральную Раду. Перадаюць ей цывільнае судоўніцтва, школьніцтва й абяцаюць перадаць таксама адміністрацыю. Раду з прэзыдэнтам на чале аднак паклікае й мае права адклікаць Генэральны Камісар. Зноў-жа й гэты новы твор далёкі ад прарэгатываў БССР у рамах Сталінскай канстытуцыі і, зразумела, ня можа раўняцца з абяцанкамі Сталіна, які кідае на Беларусь лепшых прапагандыстых пад іменем беларускіх патрыётаў, беларускую прэсу й літаратуру, у той час калі пад немцамі беларуская інтэлігенцыя з трудам здабывае права на адну беларускую газэту, а на тэрыторыях усходніх немцы, пад уплывам расейскіх дарадчыкаў, выдаюць газэты на расейскай мове. Немцы выказаліся поўным незразуменьнем беларускай нацыянальнай праблемы. У рэзультаце гэтага паяўляецца аж 200.000 беларускіх партызанаў, апанаваных у пераважнай меры бальшавікамі, якія дыспанавалі тэхнічнымі сродкмі. Нацыянальная партызаншчына дзейнічае або самастойна ў вельмі цяжкіх абставінах, будучы ўзятай у два агні — з аднаго боку нямецкі, з другога бальшавіцкі, або маскуецца сярод чырвоных партызанаў, каб прынамсі гэткім чынам мець уплыў на ход нязьнейшых падзеяў. Немцы прайграюць вайну не дзякуючы стварэньню другога фронту, які толькі прысьпешыў ход падзеяў, але выключна дзеля няўмелай разьвязкі нацыянальнай праблемы.

(Заканчэньне на 3 балоне)

Саветы маюць атамную бомбу

У пачатку гэтага месяца Белы Дом у Вашынгтоне падаў да ведама, што нядаўна адбыўся ў Савецкім Саюзе выбух атамнае бомбы. Сусьветная прэса зацеміла, што гэтым разам адбыўся выбух запраўднай атамнай бомбы, а не атамная эксплёзыя, якая мела месца ў 1950 г. 6 кастрычніка выбух атамнае бомбы ў Саветах пацьвердзіў сам Сталін у сваім інтэрв'ю, дадзеным «Праўдзе». Ані эксплёзыя атамнае бомбы ані інтэрв'ю Сталіна ня выклікалі на Захадзе ніякае сэнсацыі.

Аднак у сувязі з гэтым выпадкам было пададзена да ведама, што ЗША маюць так удасканаленую атамную зброю, якая, бяз шкоды для собскае арміі, можа быць пасьпяхова ўжываная на фронце супраць ворага. Таксама ў сувязі з гэтым узмоцніліся дамаганьні палітычных і ваенных колаў Захаду павялічэньня прадукцыі атамнае зброі, паколькі з прычыны становішча Саветаў немагчыма ўстанавіць кантролі атамнае энэргіі.

Гэтак сэнатар Мэк Магон — старшыня кангрэсавае камісыі атамнае энэргіі — зажадаў узбраеньня ўсіх родаў амэрыканскае арміі атамным аружжам і шасьціразовага павялічэньня прадукцыі атамнае энэргіі. Гордон Дын нядаўна заявіў, што ЗША хутка будуць мець дастатковую колькасьць featureрознага атамнага аружжа, што змогуць лёгка супрацьставіцца ўсякаму атамнаму нападу. Дзеля прыкладу ўспомніў ён пра атамныя артылерыйскія снарады, атамныя тарпэды, ракеты й бомбы для нізка лётаючых самалётаў, якія сяньня прадукуе Амэрыка.

На землях Беларусі

Маскоўская «Праўда» супраць менскай «Зьвязды»

Абнаглелы паход расейскага вялікадзяржаўніцкага шавінізму супраць усякіх праяваў беларускага нацыянальнага жыцьця ў БССР, паколькі такія праявы могуць там яшчэ мець месца, набірае што раз шырэйшага размаху, становіцца агульнай і згары заплянаванай акцыяй чырвонага Крамля й абыймае ўсе галіны публічнага жыцьця беларускага народу. Нядаўна папаў пад войстры абстрэл орган ЦК камуністычнай партыі Беларусі «Зьвязда», якая выходзіць ужо трыццаць пяць гадоў. Тым ня менш аднак цэнтральны камуністычны орган СССР «Праўда» знайшла ў ей мноства скрыўленьняў на ідэалягічным фроньце й накінулася на яе з войстрай атакай у нумары за 9 жніўня сёлета. Там, між іншым, чытаем наступнае:

«Рэдакцыя «Зьвязды» праяўляе недапушчальную абыякавасьць да прапаганды марксыстоўска-ленінскай тэорыі.

Недастаткова асьвятляе газэта пастаноўку справы на ідэалягічным фроньце. Нядаўна ў Менску адбыўся сход інтэлігенцыі. У справаздачы аб сабраньні былі прыведзеныя словы аднаго з выступаючых: **«Інстытут філязофіі й права Акадэміі Навук БССР адстае, у навуковых працах інстытуту былі дапушчаныя сур'ёзныя памылкі. У інстытуце не разьвернутая бальшавіцкая крытыка й самакрытыка. Адстаюць інстытут літаратуры, мовы й мастацтва, інстытут гісторыі й некаторыя іншыя . . .»**

Дарма шукаць якіх-небудзь выступленьняў «Зьвязды» з гэтае прычыны. Быў навет такі выпадак у практыцы рэдакцыі. Чатыры навуковыя працаўнікі Менску запрапанавалі ей крытычны артыкул пра кнігу Кірушына «Ватыкан на службе рэакцыі». Рэцэнзэнты пісалі аб заганах кнігі. Рэцэнзыя ня была надрукаваная.

У рэдакцыі не ўважаюць за патрэбнае выступаць так-жа ў справе прынцыповых пытаньняў літаратуры. У крытычна-бібліяграфічных артыкулах разьбіраюцца толькі прыватныя заганы тых або іншых твораў. Пытаньні-ж ідэйнага кірунку рэдакцыя ўнікае ставіць.

Нядаўна на партыйным сходзе абгаварваўся артыкул «Праўды» «У Саюзе Пісьменьнікаў Беларусі супраць ідэалягічных скрыўленьняў у літаратуры». У справаздачы аб сходзе рэдакцыя не асьмелілася назваць М. Танка, які быў заатакаваны крытыкай за пераклад ганебнага верша В. Сасюры «Любі Украіну».

На пашыраным паседжаньні ўправы Саюзу пісьменьнікаў войстра было пастаўлена пытаньне аб якасьці перакладаў твораў беларускіх пісьменьнікаў на расейскую мову. У рэдакцыі была ўжо набраная справаздача аб гэтым паседжаньні. У ей заўважвалася, напрыклад, што: **«часта пераклады выкрыўляюць зьмест твораў, абніжаюць іхную ідэйную й мастацкую вартасьць».**

Справаздача не паявілася ў газэце. Ейнае месца заняла інфармацыя, у якой не асталося навет намёку аб дрэнных перакладах П. Кабзарэўскага, Д. Осіна й іншых.

Незаслужана расхваліла газэта п'есу «Песьня нашых сэрцаў» Палескага. Ці не таму толькі, што аўтар п'есы — «свой чалавек», адказны сакратар рэдакцыі? У рэдакцыіі наагул моцна выступаюць элемэнты сямейнасьці.

Пры такіх звычаях у некаторых працаўнікоў газэты прытупілася пачуцьцё партыйнасьці ў працы. Загадчык аддзелам партыйнага жыцьця на пытаньне: чаму ягоны аддзел дрэнна асьвятляе ідэалягічную работу партарганізацыі?, — адказаў: — Да ідэалягічных пытаньняў у нас рукі не даходзяць . . .»

Якімі спосабамі ня ўбівалі бальшавікі беларусам на працягу звыш трыццаці год ленінска-сталінскую ідэалёгію, усё-ж такі асталася яна чужой для беларускага народу. І як ня выкарэньвалі яны беларускіх патрыятычных пачуцьцяў з душы беларусаў і сколькі за гэтыя пачуцьці не арыштоўвалі, расстрэльвалі ссылалі ў канцэнтрацыйныя лягеры Сібіру й халоднае поўначы, выкараніць іх да рэшты не змаглі. Яны асталіся й надалей найбольш істотнай арганічнай часткай душы беларускага народу.

ЗША МАЮЦЬ НАЙБОЛЬШ ЖАЎНЕРАЎ

На 30 чэрвеня сёлета ЗША прапарцыянальна да свайго насельніцтва мелі шмат болей жаўнераў пад зброяй, чымсьці ўсе эўрапэйскія краіны, што дастаюць амэрыканскую замежную дапамогу. На кажную 1.000 жыхароў прыпадае ў ЗША 21,2 жаўнеры, тады калі ў Францыі — 17,8, у Вялікабрытаніі — 15,7, у Бэльгіі й Люксэмбургу — 12,2, у Партугаліі — 10,6, у Галяндыі й Нарвэгіі — 9,7, у Італіі — 6,5, у Даніі — 6,3. Сярэдняя эўрапэйская прапорцыя — 12,6 жаўнераў на кажную 1.000 жыхароў.

Не павінна быць аніводнага працуючага або іншым спосабам зарабляючага беларуса, які-б чытаў «Бацькаўшчыну» задарма! Таксама не павінна быць аніводнага сьвядомага беларуса, які-б яе ня чытаў зусім!

З ЦЫКЛЮ ГОМЕЛЬ І ГОМЕЛЬШЧЫНА

ПРЫЧЫГУНАЧНЫЯ Раены Гомельшчыны

Прыступаючы да апісаньня раёнаў Гомельшчыны, неабходна адзначыць, што прычыгуначныя раёны вакол гораду Гомеля маюць спэцыфічныя асаблівасьці. У гэтых раёнах сярод сельскага насельніцтва ёсьць ня мала кваліфікаваных спэцыялістых-майстроў і простых работнікаў, якія у бальшыні працуюць у чыгуначных майстэрнях Гомеля і частокав на прадпрыемствах. Яны досыць моцна зьвязаны зь вёскаю, маюць зямелныя надзелы, собскія дамы ды дамашнюю жывёлу. Пры розных цяжкасьцях гарадзкога жыцьця ім лягчэй перажываць у вёсцы няпэўныя часы савецкіх экспэрымэнтаў.

У дарэвалюцыйныя часы сувязь зь вёскаю й собская гаспадарка не рабіла аніякіх перашкодаў для іхнай працы. Зусім інакш разглядаюць бальшавікі гэтую катэгорыю работнікаў. Прыгарадныя работнікі ў меншай ступені залежылі ад прадпрыемства, іх цяжэй было прыцягнуць да ўдарніцтва, стаханаўшчыны, прымусіць удзельнічаць у розных палітычных кампаніях, загнаць на сходы, у розныя клюбныя гурткі, бо ўсе гэтыя нудныя кампаніі павінны былі адбывацца паза гадзінамі працы за кошт адпачынку. Іх цярпелі, але ўсякімі спосабамі стараліся пазбавіць зямельных надзелаў, дамашняй жывёлы ды зьвязаць цясьней з прадпрыемствам. Толькі сталы недахоп памешканьняў у горадзе ды недахоп рабочых рук не далі магчымасьці спралетарызаваць гэтую досыць упорыстую частку працоўных. Гаспадркі на вёсцы гэтых работнікаў таксама значна цяжэй было загнаць у калгасы й падпарадкаваць там прыгоннай дысцыпліне.

Гомельскі сельскі раён — гэта раён садоў, агародаў з харошымі сартамі яблыкаў, грушаў, ягад ды гародніны. Пры садох у школках вырашчваліся добрыя прышчэпы, якія задавальнялі патрэбы значнай часткі Гомельскай акругі. Раён у некалькіх кірунках зьяўляецца перасечаны чыгуначнымі й шасэйнымі дарогамі, мае добрую сувязь з горадам. Насельніцтва жыве бойкім, рухлівым жыцьцём, продажай сваей сельска-гаспадарскай прадукцыі, працай на чыгунцы й прадпрыемствах Гомеля. Ня толькі ў горадзе, але й у раёне можна мець прыработкі. Так у 18 клм. ад Гомеля пры станцыі Касьцюкоўка знаходзіцца вялікая мэханізаваная гута з пяцьцю тысячамі работнікаў. Гута выраблягла розныя гатункі шкла: люстэркавае, шліфаванае, крыштальнае, бемскае, шкло для самаходаў і г. п. На гуце ўсе працэсы працы былі мэханізаваныя. Прадпрыемства гэтае зьвязанае пад'язднoю чыгункаю. На месца выкапкі высокаякаснага пяску, які быў патрэбны для шкляной вытворчасьці й давозіўся з Нова-Беліцы, таксама была праведзеная чыгуначная лінія.

У раёне знаходзіцца г. зв. конны завод, які памяшчаецца ў былым маёнтку Прудок і стыкаецца з горадам. На заводзе выгадоўваюцца пароды лёгкіх ангельскіх скакуноў і іншых коней.

На паўдзённы ўсход ад Гомеля знаходзіцца Цэрахоўскі раён, які мяжуецца з Украінай і невялікай сваей часткай з Расейскай Савецкай Фэдэрацыйнай Сацыялістычнай Рэспублікай. На мяжы з Украінскай ССР зьвяртае на сябе ўвагу гістарычнае мястэчка Падабранка, якое аддзяляецца невялікай рэчкай ад досыць значнага раённага цэнтру Дабранка Чарнігаўскай акругі. Згодна зь гістарычнымі дадзенымі праз Дабранку праходзіла мяжа, якая аддзяляла Беларусь ад Расеі да 1772 г. Паводля гістарычных даведак ведамы расейскі бунтар Амельян Пугачоў нейкі час хаваўся на Беларусі, а ў 1771 г. перайшоў у Дабранцы мяжу, перабраўся на Волгу й пры царыцы Кацярыне II падняў там бунт.

Насельніцтва Церахоўскага раёну ў бальшыні сваей займаецца адходніцтвам. Церахоўцы вельмі добрыя будаўнікі-каменшчыкі. Таму вясною з пачаткам будаўлянага сэзону арцелі будаўнікоў пакідаюць вёскі й накіроўваюцца ў гарады або на іншыя будаўніцтвы. У вёсках на гаспадарках астаюцца толькі жанчыны ды падросткі. Знаходзяць таксама працу ў Гомелі на чыгунцы, на прадпрыемствах ды на блізкай цэлюлёзна-папяровай хвабрыцы ў Добрушы.



Гомельская акруга БССР

У свой час яшчэ да калектывізацыі Церахоўскі раён быў далёка ведамы разьвітым тут пчалярствам. К канцу ліпеня й асабліва ў жнівені церахоўскія пчалаводы дастаўлялі на кірмашы свой тавар — мёд. Кадаўбы мёду ліповага, грачнёвага, верасовага, рамовага-чыстага, як янтар, бяз воску, а то расфасованага ў невялікія слоікі прапанаваліся пакупніку. Аматары мелі магчымасьць дастаць сьвежы пахучы мёд у сотах, над якімі яшчэ кружыліся пчолы. Пасьля правядзеньня калектывізацыі гэты вельмі прыемны промысл заняпаў. Былі імкненьні будаваць пасекі-гіганты. Але за гэтую справу браліся няўмекі, адурманеныя гігантаманіяй. Пасекі дасьветчаных практыкаў — дасьледавальнікаў пчалаводаў былі разбураныя, а новыя пасекі-гіганты не пабудаваныя. У выніку гэтых неразумных захадаў асталіся толькі адны прыемныя ўспаміны, але бязь мёду.

Ад пахучага салодкага мёду пяройдзем да горкай цыбулі. Нідзе ня была такою ўрадліваю цыбуля й часнок, як у Церахоўскім раёне. Такія тут, відаць, асаблівасьці глебы. Попыт на цыбулю й часнок быў заўсёды. Кажны год сюды прыяжджалі нарыхтоўшчыкі ад розных і мясных прадпрыемстваў.

Раённы цэнтр знаходзіцца ад чыгункі ў вадлегласьці паўтара кілямэтра. Гэта невялікі пасёлак, які ўзьнік з утварэньнем Церахоўскага раёну. Пасёлак гэты ня мае тэндэнцыі да разьвіцьця ў буйны населены пункт. Усё гаспадарска-гандлёвае жыцьцё раёну сканцэнтравалася пры чугуначнай станцыі. Тут-жа знаходзяцца ўсялякія нарыхтоўчыя й гандлёвыя канторы, базы й склады.

18 клм. на ўсход ад Гомеля, сярод прыгожых сасновых лясоў, раськінуўся горад Добруш. Каля гораду праходзіць чыгунка, а сам горад перасякае быстрая поўнаводная рэчка Іпуць. Усё насельніцтва Добруша так ці інакш зьвязанае зь вялікай цэлюлёзна-папяровай хвабарганізацыяў, нарыхтоўваліся дзесяткі вагонаў цыбулі й часнаку для харчовых рыкай, ды й сам горад вырас пры ёй і дзякуючы ёй. Хвабрыка была пабудаваная некалькі дзесяткаў гадоў таму назад князем Паськевічам. Яна будавалася на вышыні тагачаснай тэхнікі. Папера ў ей выраблялася высокай якасьці й экспартавалася за мяжу. Добрую славу мела Добруская папера й у Беларусі.

Хвабрыка працавала на мясцовай сыравіне, толькі некаторая частка саломы для вытворчасьці паперы давозілася. Савецкія «наватары» з дасьледчага інстытуту ставілі пытаньне аб скарыстаньні для папяровай прамысловасьці кастрыцы ад перапрацоўкі лёну. Але ад гэтага наватарства прыйшлося хутка адмовіцца. Ільнаапрацоўчыя заводы раськіваныя па ўсей Беларусі, у бальшыні яны знаходзяцца на поўначы, у Віцебшчыне. Нарыхтоўка ды перавоз на хвабрыку кастрыцы значна павысіла-б кошт паперы.

Бурлівая Іпуць выкарыстоўваецца хвабрыкай для здабываньня электраэнэргіі. Для патрэбаў гэтага прадпрыемства таксама вядзецца часткова мэханізаванае дабываньне торфу, які падаецца падвясною дарогаю.

У даўнейшыя часы, калі хвабрыка была яшчэ толькі пабудаваная, ейнае кіраўніцтва ставіла сабе за мэту мець сталыя кадры работнікаў, якія былі-б моцна прывязаныя да прадпрыемства.

ШУКАЕМ РАЗЬВЯЗКІ

(Заканчэньне)

мы на Усходзе Эўропы, у тым ліку й на Беларусі.

Адна балонка гісторыі зачыненая. Бальшавікі апанавалі ўсю цэнтральную Эўропу й цьвёрдай нагой сталі ў Заходняй Эўропе. Здавалася-б, што цяпер ім няма патрэбы лічыцца з нацыянальнымі дамаганьнямі нанава паняволеных народаў. Аднак узрост нацыянальнай сьведамасьці гэтых народаў, у тым ліку й беларускага, змушаюць іх пайсьці на новыя ўступкі. Каб заспакоіць узросшыя нацыянальныя дамаганьні беларускага народу, яны падносяць БССР да гаспадарстваўскай годнасьці, ставячы яе на адну ўзроўню з Расеяй. Беларусь выступае на міжнародным форуме, як самастойнае гаспадарства, яна мае свайго дэлегата ў Задзіночаных Нацыях, Радзе Бясьпечнасьці і г. п.

Новы бальшавіцкі туман, каб прысланіць запраўдную рэчаіснасьць, масавы тэрор і зьдзек над беларускім народам, даў пажаданыя рэзультаты. Сотні тысяч беларусаў прымусова вывезеных у Нямеччыну, замучаных непасільнай працай у нямецкіх лягерах, яшчэ раз падаюць ахвярай бальшавіцкага ашуканства. Няважна, што Беларусь яшчэ ў саюзе з Савецкім Саюзам, але яна-ж мае цяпер раўнапраўны голас у г. зв. сям'і савецкіх народаў. Цяпер напэўна свае людзі будуць гаспадарамі на Беларусі. Тымчасам савецкае радыё бесьперапынна іх корміць зманлівай прапагандай. Яны чуюць перадачы на роднай мове, яны чытаюць у заходняй прэсе аб выступленьнях беларускіх дэлегатаў. Тут зайграў нацыянальны гонар. Пры тым шмат што зьмянілася. Цэрквы ўзноў адчыненыя. Замаскаваныя бальшавіцкія агенты падшэптваюць, што навет праўдападобна калгасы маюць быць скасаваныя. Чаго-ж тады чакаць?

Больш асягнуць немагчыма, бо з боку заходніх альянтаў няма ніякіх прыкметаў зацікаўленьня нутранымі праблемамі Савецкага Саюзу. Заходнія гаспадарствы выпярэджваюцца ў даказваньні свае дружбы ў дачыненьні да Савецкага Саюзу. Савецкія рэпатрыяцыйныя місыі свабодна цыркулююць па Заходняй Эўропе. Шматлікія выпадкі прымусовае рэпатрыяцыі пры помачы амэрыканскіх штыкоў нічога добрага не варожаць. Не памагае перасьцярагаючы голас беларускага нацыянальнага актыву, які й сам часта мусіць хавацца перад рэпатрыяцыйнымі камісыямі. Захад астаецца глухім на справядлівыя нацыянальныя патрэбы паняволеных бальшавізмам народаў. **Др. Б. Рагуля**

(Заканчэньне ў наступным нумары.)

ПАПРАЎКА: Падчас ламаньня апошняга (71) нумару «Бацькаўшчыны» пад артыкулам «Шукаем разьвязкі» было памылкова ўстаўленае прозьвішча аўтара М. Відук, замест Др. Б. Рагуля. Таму ў далейшых частках артыкулу гэтую памылку папраўляем. Рэдакцыя

Распачынаючы новы этап

Лювэн. Панядзелак 1-га кастрычніка. Пачынаецца новы акадэмічны год. Вуліцы ўтульнага, ціхага гарадка ажывіліся, зышумелі. Сустракаюцца йзноў старыя й новыя сябры дзеля супольнае прыцы, дзеля пракладваньня дарогаў як у сваім собскім жыцьці, гэтак і ў жыцьці тых народаў, да якіх яны належаць.

Паводля ўнівэрсытэцкае традыцыі ўрачыстасьць адкрыцьця новага акадэмічнага году пачалася паходам адзетых у тогі прафэсароў на чале з рэктарам унівэрсытэту й прадстаўнікоў студэнцкіх арганізацыяў із сваімі сьцягамі. Прыемна было бачыць між іншых і новы сьцяг Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне: на хварбах унівэрсытэту — бел-чырвона-белы сьцяг з Пагоняй, унівэрсытэцкай эмблемай ды Ярылавым крыжам на палцы. Гэтая працэсыя накіравалася па запоўненых народам вуліцах ад ўнівэрсытэцкае галі да касьцёла сьв. Пятра, дзе была адслужаная Яго Магніфіцэнцыяй Рэктарам лювэнскага ўнівэрсытэту ўрачыстая багаслужба.

Пасьля багаслужбы, у вялікай унівэрсытэцкай залі ў прысутнасьці прадстаўнікоў бэльгійскага ўраду, на заканчэньне сваей прамовы Рэктар абвесьціў новы акадэмічны год адкрытым.



У першым радзе ў белых шапках із сьцягам свае арганізацыі прадстаўнікі Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне падчас урачыстага паходу вуліцамі гораду. З-заду сьцягі двух факультэтаў лювэнскага ўнівэрсытэту.

У наступную нядзелю Беларускае Студэнцкае Згуртаваньне адсьвяткавала пачатак новага акадэмічнага году ў цясьнейшым крузе. Галоўнай часткай гэтае ўрачыстасьці была сьвятая літургія, адслужаная паважаным айцом Аўгенем Смаршчком у Беларускай Праваслаўнай Капліцы ў Лювэне ў прысутнасьці беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў. Глыбокая прамова айца Аўгеня моцна закранула прысутных і шмат дала ім да думаньня й перадуманьня:

«Вы-ж цьвет народу Вашага! — казаў ён. Вы — запэўненьне ягонае будучыні! Глыбокая сьведамасьць гэтага прыносіць ня толькі гонар, але й накладае вялікія абавязкі.

Узгадаваньне чалавека трывае ад нараджэньня аж да сьмерці. І ніводзін чалавек у сваім жыцьці не дасягне ступені дасканальнай. Хто гэта цьвердзіць, той затрымоўваецца ў працэсе свайго развою . . .

Усе мы ўжо ў гадох, у якіх існуе й павінна існаваць г.зв. самаўзгадаваньне. Яно значыць, што мы ведаем мэты й спосабы, ведаем абавязкі й правы ды маем даволі сілы волі й самакрытыкі, каб сябе ўзгадаваць.

Але існуе яшчэ ральля, якая спарадзіла нас, дзе засталося нашае карэньне, хоць нас насільлем ад яе адлучылі. Карэньне нашае — там, на Бацькаўшчыне! Пільнуйма, каб нашая духовая лучнасьць з Бацькаўшчынай не перарвалася, каб не пасохлі мы на чужыне, як засыхаюць кветкі, вырваныя з агароду...

Не марнуйце талентаў, якія даў Вам Бог, як слугам сваім, не закопвайце іх, а імкніцеся да разьвіцьця іхнага ў пагоні не за славай, а за ўдасканаленьнем асабістым у кажнай галіне. Дыплёмы й адзначэньні, слава й павага між людзей прыйдуць самі, як вынік Вашае працы . . .

Вось мая навука душпастырская й сяброўская ды пажаданьні Вам на дарогу новага акадэмічнага году, новага й мазольнага этапу працы над сабою і, памятайма, ня толькі для сябе». Я. З.

Незалежнасьць, фэдэрацыя...

(Заканчэньне)

пасьля аднаўленьня імі ў 1917—18 г.г. сваіх незалежных гаспадарстваў, бальшавікамі. Ніводзін з гэтых народаў ніколі не пагаджаўся з расейскай акупацыяй, а ўсе яны бесьперапынна вялі ідэалягічнае, а часта й збройнае змаганьне за сваё вызваленьне. А пасьля развалу царскае імпэрыі гэтыя народы ў 1917—18 г. г. абвесьцілі свае нацыянальныя сувэрэнныя гаспадарствы, якія пазьней былі сілаю зьнішчаныя расейскім бальшавізмам.

Выхадным пунктам у вадбудове гаспадарстваўскай незалежнасьці беларускага народу быў Усебеларускі Кангрэс, скліканы ў Менску ў сьнежані 1917 г., дэлегаты якога паходзілі з усяе этнаграфічнае тэрыторыі Беларусі й былі выбраныя народам на падставе ўсіх дэмакратычных выбарных прынцыпаў. **Вось-жа гэты Кангрэс, які высказаўся за гаспадарстваўскую незалежнасьць Беларусі, як і абвешчаньне 25 сакавіка 1918 г. выбранай ім Радай Беларусі вольнай незалежнай дэмакратычнай рэспублікай і было тым агульнанародным галасаваньнем, якое пастанавіла аб лёсе беларускага народу. Пастановы Усебеларускага Кангрэсу, як і Акт 25 Сакавіка ня страцілі й сяньня сваей палітычнай важнасьці й юрыдычнай моцы, бо пасьля гэтага беларускі народ выражанай ім цераз сваіх выбраных прадстаўнікоў пастановы не зьмяніў.**

Прапанаваны расейцамі плебісцыт мы адкідам не таму, што баімся ягоных вынікаў. У пазытыўных для беларускай нацыянальнай справы выніках галасаваньня мы ня сумляваемся, бо беларускі народ у сваім бесьперапынным змаганьні дастаткова даказаў, што ягоным найвышэйшым ідэалам ёсьць вольная й незалежная Беларусь. Ходзіць тут пра тое толькі, што на такое галасаваньне згаджацца ня маем ніякага права, бо гэта было-б супраць волі беларускага народу, выражанай ім у 1917 г. Калі-б мы згадзіліся на такое галасаваньне, дык гэтым самым перакрэсьлілі-б усе пастановы Усебеларускага Кангрэсу й Акту 25 Сакавіка.

Такое галасаваньне ня ёсьць мэтазгодным яшчэ ў сувязі з тым, што Беларусь, як і цэлы рад іншых краінаў Савецкага Саюзу, навет у Сталінскай канстытуцыі юрыдычна мае загарантаваныя ўсе нацыянальныя правы нараўні з расейскім народам уключна з правам аддзяленьня ад Савецкага Саюзу. Праўда, гэта толькі юрыдычна, бо запраўднасьць ёсьць зусім іншая. Тым ня менш аднак фармальная незалежнасьць Беларусі вызнана навет усім дэмакратычным сьветам фактам прыняцьця дэлегацыі БССР ў склад Задзіночаных Нацыяў, як раўнапраўнага сябры. **Сяньня можа толькі ставіцца пытаньне аб зьмене накінутага сілаю бальшавіцкага рэжыму незалежнай з гледзішча праўнага Беларусі, а не аб існаваньні беларускай незалежнай рэспублікі, бо гэта ўжо зьяўляецца дакананым фактам.** Таму расейская прапанова народнага галасаваньня аб тым, ці Беларусь мае быць незалежнай, ёсьць з фармальна-юрыдычнага гледзішча вялікім крокам назад у параўнаньні навет з тым, на што здабыўся Сталін.

З другога боку расейцы, дамагаючыся такога галасаваньня, могуць мець на мэце ня што іншае, як імкненьне да захаваньня адзінай і непадзельнай Расеі. Яны надзеяцца, што беларускі, як і іншыя паняволеныя народы, да такой ступені паддаліся працэсу русыфікацыі, прымусова праводжанай Сталінскім бальшавізмам, што ў бальшыні сваей выскажуцца супраць аддзяленьня ад Расеі. У гэтым і заключаюцца антыдэмакратычныя імпэрыялістычныя тэндэнцыі расейскае праграмы. Калі-б расейскія арганізацыі — закладчыкі Савету ўзапраўды вызбыліся ўсякіх імпэрыялістычных намераў у дачыненьні да нерасейскіх народаў, калі-б яны перабудавалі свой сьветапагляд у духу дэмакратычных ідэяў Атлянтычнай Карты, дык напэўна ня ставілі-б тады так далёка йдучых абмежаваньняў для нерасейскіх народаў, якімі ёсьць такі спосаб народнага галасаваньня, а вызналі-б статус кво — пастановы Усебеларускага Кангрэсу й Акту 25 Сакавіка.

Калі-б аднак расейцы ня мелі ў дачыненьні да нас ніякіх захопніцкіх мэтаў, а толькі жадалі, — як яны апошнім часам заяўляюць, — справу будучых гаспадарстваўскіх узаемадачыненьняў зь імі абапёрці на свабодна выяўленай волі нашых народаў, дык гэтае волявыяўленьне магло-б быць праведзенае іншым, зусім аб'ектыўным спосабам, на які згадзіліся-б бясспрэчна беларускія палітычныя дзейнікі і які ў нічым не парушаў-бы нацыянальных інтарэсаў расейскага народу, як і выключаў-бы ўсякія засьцярогі й падазрэньні аб замаскаваным імпэрыялізьме расейскіх эміграцыйных палітыкаў. Гэты спосаб быў-бы наступны: **расейцы, вызнаючы ў дачыненьні да беларускага народу статус кво — пастановы Усебеларускага Кангрэсу й Акту 25 Сакавіка, задавольваюцца, што беларускі народ правядзе галасаваньне аб тым, ці ён жадае, каб абвешчанае ім у 1918 годзе незалежнае гаспадарства асталося поўнасьцю самастойным ці каб увайшло яно ў фэдэрацыйную сувязь з расейскім народам, а таксама й з тымі народамі, што ўжо будуць у такой-жа фэдэрацыйнай сувязі з расейцамі.**

Увядзеньне такога пункту ў нацыянальную праграму Савету, як аснаўнога ў разьвязаньні нацыянальнага пытаньня, ні ў чым не парушала-б нацыянальных інтарэсаў расейскага народу, бо гэтае пытаньне зусім яго не датычыла-б; яно датычыла-б толькі нерасейскіх народаў, у нутраныя справы якіх расейцы не павінны былі-б умешвацца, калі-б хацелі сабе выставіць атэстат запраўдных дэмакратаў. Згода з расейскага боку на такую пастаноўку справы азначала-б вызнаньне расейцамі справядлівых нацыянальных правоў гэтых народаў, у чым расейскія палітыкі мелі-б добрую нагоду задэманстраваць свой дэмакратызм і антыімпэрыялізм. З другога боку, нерасейскія народы, згаджаючыся правесьці агульнае галасаваньне ў справе фэдэрацыйнай сувязі з Расеяй, выказалі-б максымум добрае волі й нацыянальнага выразуменьня, яны даказалі-б, што, ня гледзячы на некальківяковую жорсткую няволю ў складзе расейскае імпэрыі, ніякае варожасьці й няпрызьні да расейскага народу ня чуюць. Таму няма абсалютна ніякае падставы адмовіцца ад такога сфармуляваньня нацыянальнае праграмы. Адмова ад такога разьвязаньня нацыянальнае праблемы сьветчыла-б толькі аб тым, што запэўненьні расейскіх палітыкаў аб іхнай згодзе на самавызначэньне нерасейскіх народаў і іхную гаспадарстваўскую незалежнасьць зьяўляюцца пустымі словамі, пад якімі хаваецца традыцыйная імпэрыялістычная палітыка Масквы.

З расейскага боку часта прыходзіцца пад нашым адрасам слухаць мянушкі «сэпаратыстых» і «нацыянальных шавіністых», як і закіды, што гэта мы быццам стаім на перашкодзе стварэньню супольнага фронту ў змаганьні супраць бальшавізму, які зьяўляецца найвялікшым злом, бязь зьнішчэньня якога ня можа быць і мовы аб разьвязаньні ў той або іншы спосаб нашага нацыянальнага пытаньня. Але ці нацыянальным шавіністым зьяўляецца той, хто бароніць справядлівых нацыянальных правоў свайго народу, ці той, хто ў імя спрадвечнага расейскага імпэрыялізму на гэтыя правы пасягае? І ці прыпісваны нам ярлык «сэпаратыстыя» ёсьць нечым праступным і антыдэмакратычным у той час, калі мы толькі зьяўляемся выканальнікамі волі беларускага народу, свабодна выказанай ім у 1917 г.? Калі мы за свае прыродныя й справядлівыя імкненьні заслужылі на пагардлівую мянушку «сэпаратыстых» і «нацыянальных шавіністых», дык як тады назваць тых расейцаў, што ўсімі сіламі й за ўсякую цану намагаюцца затармазіць натуральны нацыянальны развой паняволеных народаў з мэтаю ўтрыманьня іх у рамах расейскае імпэрыі, з мэтаю іхнае русыфікацыі й растапленьня ў «вадзіным расейскім моры»? Адказ на гэтае пытаньне няхай чытачы знойдуць самі.

Ня гэткім шляхам трэба йсьці да задзіночаньня ўсіх антыбальшавіцкіх сілаў дзеля змаганьня з найвялікшым злом сучаснасьці й дзеля наладжаньня шчырага супрацоўніцтва між нашымі народамі! Праўдзівым і ўзапраўды дэмакратычным шляхам, што хутка прывёў-бы нас да жаданае мэты, быў-бы шлях, які выбрала Ангельшчына, ЗША, Галяндыя й іншыя каляніяльныя калісьці гаспадарствы ў дачыненьні да паняволеных імі народаў. Дык чаму-ж на гэткі шлях ня хочаць узыйсьці расейцы?

Ці дойдзе да стварэньня з расейцамі супольнага фронту ў змаганьні з бальшавізмам, ці правамоцныя й аўтарытэтныя нацыянальныя прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў будуць змушаныя астацца вонках гэтага фронту, будзе залежыць выключна ад расейцаў. Над усім гэтым павінны сур'ёзна задумацца расейскія палітыкі й у інтарэсах ня толькі нашых, але й сваіх собскіх зрабіць з гэтага адпаведныя вывады. Над гэтым павінен таксама задумацца й Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня Народаў Расеі, які патрануе акцыі Керэнскага.

Язэп Каранеўскі

Падыймайся зь нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі,
Занімай, Беларусь, маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!

Янка Купала

Дзеля гэтага даваліся доўгатэрміновыя крэдыты работнікам для будаўніцтва й адводзіліся зь земляў князя дастатковыя вучасткі зямлі. Работнікі будаваліся на собскі кошт, іхная ініцыятыва ня была зьвязваная адміністрацыяй. Дабрушане будаваліся не на сьпех, а на стала, з прыбудоўкамі для каровы, парасяці ды дамашняй птушкі. У Добрушы ня відаць было дашчатых баракаў, у якіх бязь мінімальных выгадаў і ў цеснаце мучыліся работніцкія сем'і, як гэта назіралася пры гутах ды пільнях.

Пасьля рэвалюцыі парадкі зьмяніліся. Цьвёрды грунт з пад ног Дабрушан трэба было выбіць, зрабіць іх запраўднымі пралетарамі, каб яны не ўглядаліся на свае агароды, садкі, ня мелі карысьці із свае каровы ці парасяці. Работніку трэба глядзець на комін прадпрыемства, — гавораць бальшавікі. Дабрушанам не падабаліся новыя парадкі, — перакідваньне работнікаў у другія гарады ды прывоз новых работнікаў. Ім хацелася, каб Добруш быў для дабрушан. Аднак новая палітыка праводзілася няўхільна. Старое й спакойнае, часта зь мілымі прывычкамі, ламалася й нішчылася. Стары Добрускі работнік асабліва, усё новае выклікае ў яго ня добры смак, які трываў гадамі, а можа й цяпер яшчэ трывае.

На захад ад Гомеля па абодвых бакох чыгункі ляжыць Уваравіцкі раён. Ён займае параўнальна невялікую тэрыторыю, добра зьвязаны з горадам, бо, апрача чыгункі, праз раён праходзіць шасэйная дарога. Гэта дае поўную магчымасьць вольным рукам здабыць працу на прадпрыемствах Гомеля, на чыгунцы, ды на гуце ў Касьцюкоўцы, а прадукты сельскай гаспадаркі знайдуць збыт у Гомелі. Аснаўная маса насельніцтва займаецца сельскай гаспадаркай, тут таксама пашыранае садоўніцтва. Для пераапрацоўкі садавіны й розных ягадаў працуе ў раёне завод, што вырабляе мармаляду й канфітуры. Тут садзіцца многа бульбы, якая добра родзіць. У Уваравічах ёсьць вялікі бровар. У вадлеглясьці трох кілямэтраў ад чыгуначнай станцыі Уза знаходзіцца цэнтр раёну — Уваравічы. Гэта ёсьць невялічкае мястэчка, якое стыкаецца зь вёскаю тае-ж назвы.

Далей па чыгунцы з Уваравіцкім раёнам мяжуецца Буда-Кашалёўскі. Ён у многім падобны да Уваравіцкага раёну, толькі што з гэтага раёну менш людзей працуе на прадпрыемствах Гомеля, што тлумачыцца большай адлегласьцю ад акруговага цэнтру. Аднак Буда-Кашалёўскі раён мае й свае асаблівасьці. Мы ўжо мелі нагоду адзначыць, што гэты раён асабліва зьяўляецца багатым каштоўнымі дубовымі лясамі. Асабліва прыгожыя таварныя лясы знаходзяцца ў паўдзённа-заходняй частцы, дзе раён сваім крылом прымыкае к леваму берагу Дняпра. Вось-жа тут і знаходзіцца гэтае багацьце. Яшчэ да рэвалюцыі была ўстаноўленая эканамічная важнасьць дубовых лясоў і ў Будзе існавала гаспадарстваўская лясная школа, якая прыгатаўляла г. зв. лясных кундуктароў. Звычайна яны выконвалі абавязкі памочнікаў лясьнічых, якія мелі вышэйшую спэцыяльную асьвету й загадвалі гаспадарстваўскімі лясьніцтвамі. Вучні школы мелі добрую нагоду ня толькі назіраць штучныя пасадкі зь ляснымі культурамі, але й адбываць практыку й праводзіць досьледы ў натуральных дубовых лясох. Гэтая школа пры Саветах была закрытая.

Цэнтр раёну знаходзіцца поруч з чыгуначнай станцыяй. Пасёлак выглядае бедна й няўтульна. Ён стыкаецца зь вёскаю Буда. Бязь ніякага плянаваньня тут наляпілі розных базаў і складаў, кантораў ды раённых адміністрацыйных установаў. Усё гэта будавалася на сьпех з разнастайных будынкаў, якія сьцягваліся з астаткаў абшарніцкіх маёнткаў ды якія належылі да іншых собсьнікаў, а потым сталіся ахвярамі савецкае сыстэмы.

У пяці кілямэтрах ад чыгункі ляжыць вялікая вёска Кашалёва. У час першай сусьветнай вайны пры нямецкай акупацыі ў 1918 г. ў гэтай вёсцы ўзьнікла партызаншчына, як вынік незадаваленьня з дачыненьняў немцаў да мясцовага беларускага насельніцтва. Жорстка немцы расправіліся із сьмелымі, вольналюбнымі кашалёўцамі. Шмат мужчынаў было расстраляна, а вёска артылерыйскім агнём была зьнішчана й спалена. Такім чынам Кашалёва — гэта калыска новай беларускай партызаншчыны.

На гэтым мы канчаем апісаньне першай групы раёнаў Гомельшчыны, якія ляжаць пры чыгунцы й добра зьвязаныя з Гомелем. Жыхары гэтых раенаў адменныя ў многіх галінах жыцьця ад жыхароў іншых мясцовасьцяў. Яны энэргічныя, рухавыя, прадпрыемлівыя, здольныя, а галоўнае із собскай ініцыятывай і пісьменныя. Магчымасьць мець заработак на працы ў прадпрыемстве, набыць спэцыяльнасьць, мець часовы прыработак, лёгкі збыт дробнай прадукцыі ад сельскай гаспадаркі — усё гэта значна падняло дабрабыт насельніцтва. Гэта паклала сьлед у першую чаргу на жыльлёвым будаўніцтве, хатнім абсталяваньні ды вонкавым выглядзе самых сялібаў. Перш за ўсё кідаецца ў вочы тое, што пры новым будаўніцтве жыхар прыгараду ня цісьнецца ў вёску, а стараецца трохі адскочыць ад вёскі, на большы прастор, і там пабудавацца. Будынкі часта зробленыя з цэглы, з чыстай палавінай хаты калі не з патэфонам, дык із старым грамафонам і галяндэрскай печкай. Хатняе абсталяваньне ня носіць таго першабытнага, сумнага выгляду, якое, на вялікі жаль, яшчэ мае месца ў нашых глухіх вёсках. На вокнах тут пабачым чыстыя фіранкі й вазончыкі кветак. Сялібы ўпрыгожаныя садкамі зь яблынямі, грушамі, вішнямі, кустамі парэчак, аграсту ды градкамі трускавак. Пад вокнамі знаходзяцца гародчыкі зь кветкамі, сярод якіх мусіць быць абавязкава мальва, нагаткі, настурцыя, астра, рознакаляровая юргіня ды аграмадныя сланэчнікі. Тут-жа й пахучы бэз або язьмін. Выводзяцца й калодзежы зь дзеравянымі зрубамі, якія звычайна за дзесяткі гадоў абрастаюць мохам, цьвільлю ды грыбамі. Больш спатыкаецца калодзежаў з цэмэнтовымі зрубамі. Дзеці, як хлапцы, гэтак і дзяўчаты, наведваюць школы. Адзежа таксама прамаўляе на карысьць насельніцтва.

Усё гэта зьяўляецца вынікам нейкага дабрабыту й культурнага ўплыву гораду Гомеля. Аб адмоўных бакох уплыву гораду гаварыць ня прыходзіцца, бо яны вядомыя й ня носяць агульнага характару.

С. Горвальскі

СЬЛЯДАМІ НАШАЕ ЭМІГРАЦЫІ

Беларуская эміграцыя у Аргентыне

(Заканчэньне, глядзі № 70)

Першыя беларусы з новае эміграцыі прыбылі ў Аргентыну ў канцы 1946 г. і так па крысе прыбывалі сюды аж да 1950 г. У бягучым годзе, здаецца, ужо ніхто сюды ня прыбыў. Спачатку прыбывалі зь Італіі й Ангельшчыны былыя жаўнеры з корпусу ген. Андэрса, якія прайшлі перад гэтым Сібір і Блізкі Усход на сваім шляху да Эўропы, а адтуль трапілі сюды. Мнлгія зь іх толькі сяньня першы раз пачулі пра Беларусь і беларускі вызвольны рух. Аднак шмат іх асталося апалячанымі, яны сяньня яшчэ ня ведаюць, да каго прылучыцца. Пазьней пачалі прыяжджаць цывільныя беларусы, г. зв. ДП, зь Нямеччыны, Аўстрыі й Італіі. Тут быў розны элемэнт — ад нацыянальна сьведамых і актыўных беларусаў да поўнасьцю зрусыфікаваных, якія галоўным чынам паходзілі з Усходняй Беларусі.

Першыя, што сюды прыехалі, былі прынятыя вельмі няпрыхільна старымі эмігрантамі, якія не маглі даравацъ ім, што яны прыехалі з краіны «свабоды, шчасьця й дабрабыту», якой у іхным уяўленьні быў Савецкі Саюз, у краіну «нявольніцтва, капіталізму й эксплаатацыі». Таму старыя эмігранты, каб маглі, дык сьпіхнулі-б новапрыбылых назад у мора. Яны штурмам аблягалі эміграцыйны гатэль, каб сварыцца, а часта навет і біцца з новымі эмігрантамі, што канчалася заўсёды інтэрвэнцыяй паліцыі. Для новай беларускай эміграцыі ня было спачатку ніякага прыпынку, ня існавала ніводнай беларускай арганізацыі, да якой яны маглі-б прытуліцца. Іншыя нацыянальнасьці, як палякі, украінцы, харваты, летувісы й інш., мелі свае нацыянальныя арганізацыі, што заапякаваліся новымі эмігрантамі, якія толькі папоўнілі новымі сіламі эміграцыі гэтых народаў і расшырылі іхную грамадзка-нацыянальную дзейнасьць.

Новая беларуская эміграцыя ў Аргентыне ня ёсьць багатай колькасна. Дык гэтую колькасьць ня лёгка сяньня й устанавіць. Для арыентацыі трэба сказаць, што сюды прыехала пасьля апошняй вайны нашых людзей ад 1.000 да 1.500 асобаў. Пераважная іх колькасьць працуе на будовах, потым у хвабрыках і мэханічных варштатах, а таксама ў розных установах і кампаніях, займаючы навет паважныя становішчы. Некаторыя зь іх ужо паабжываліся й пачалі ставіць або ўжо паставілі свае дамкі. Некаторыя зьяўляюцца поўнасьцю заабсэрбаванымі заработнай працай з прагасьцю хутка ўзбагаціцца, забываючыся пра тое, што яны пакінулі дзесьці сваіх родных, якія церпяць бяду, пра трых, што ім памаглі сюды прыехаць, як і пра свае нацыянальныя абавязкі, шкадуючы граша на родную газэту або на складку ў сваю нацыянальную арганізацыю.

Першымі актыўнымі беларусамі, што тут паявіліся, былі сп.сп. Мікалай Лянкевіч і Мікалай Кейзік. Яны адразу пасьля прыезду навязалі лучнасьць з Эўропай і нашымі цэнтральнымі арганізацыямі, адкуль атрымоўвалі прэсу й літаратуру, якую пашыралі сярод сваіх суродзічаў. І калі прыехаў зь Італіі сп. Канстанцін Мерляк, гэтая сьціплая групка сабралася і, разгледзіўшы стан беларускай эміграцыі ў Аргентыне, пастанавіла не чакаць на больш спрыяльны мамэнт, а старацца заснаваць сваю нацыянальную арганізацыю. Гэтак 5 лютага 1948 г. паўстала, спачатку неафіцыяльна, беларуская нацыянальная арганізацыя, а 4 красавіка таго-ж году, ад дня першага агульнага зьезду, афіцыяльна пад назвай — Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне.

Засноўваючы сваю арганізацыю, закладчыкі мелі на ўвазе наступныя нацыянальныя патрэбы, што апраўдвалі ейную мэтазгоднасьць: 1. Памагаць нашым суродзічам, што знаходзіліся ў лягерах у Нямеччыне й іншых краінах, эміграваць у Аргентыну, 2. памагаць прыехаўшым у Аргентыну ў іхным уладжаньні й у падшуканьні працы. 3. арганізаваць беларускую калёнію ў Аргентыне дзеля грамадзка-культурнага жыцьця, абароны ейных правоў і аховы нацыянальнае культуры, 4. мець сваё нацыянальнае прадстаўніцтва ня толькі ў Аргентыне, але й у цэлай Паўдзённай Амэрыцы.

Патрэбы былі вялікія, труднасьці яшчэ большыя, а людзей спачатку было ўзапраўды мала, бо на першым зьезьдзе было прысутных ня болей дзесяці чалавек. Першая ўправа Згуртаваньня, у якую ўваходзілі сп.сп. К. Мерляк, М. Лянкевіч і М. Кейзік, распачала стараньні дзеля легалізацыі арганізацыі, што ня было справай лёгкай у вабставінах, якія ў той час існавалі. Нас, як беларусаў, тут ня ведалі, усё й аб усім трэба было тлумачыць ад пачатку. Не на меншыя перашкоды напатыкаліся стараньні дзеля атрыманьня дазволаў на ўезд у Аргентыну новых беларускіх эмігрантаў. Але дзякуючы асаблівай актыўнасьці сп. К. Мерляка, старшыні Згуртаваньня, як першая, гэтак і другая справа рушыла зь месца. Нажаль, хутка масавае выдаваньне дазволаў на ўезд дэкрэтам прэзыдэнта Аргентыны было ўстрыманае, дзякуючы чаму толькі малая колькасьць беларусаў скарыстала з дасюлешніх іміграцыйных магчымасьцяў.

З паўстрыманьнем дазволу на ўезд беларускі актыў страціў надзею на прыезд большай колькасьці сьведамых беларусаў у Аргентыну, на якую разьлічваў пры закладаньні арганізацыі. Ня гледзячы й на гэта, праца пачала разьвівацца з шырокім размахам. Агульныя зьезды Згуртаваньня адбываліся рэгулярна кажны год, быў зьменены й пашыраны статут ЗБА. Было знойдзенае собскае памешканьне, у якім памяшчаецца канцылярыя ЗБА й сьвятліца, у якой знаходзіцца бібліятэка, якая сяньня налічвае каля сотні беларускіх кніжак і каля 200 часапісаў і зборнікаў. За тры гады дзейнасьці Згуртаваньне распаўсюдзіла тысячы эгзэмпляраў беларускае прэсы сярод старых эмігрантаў, і гэта быў адзіны спосаб дабрацца да іх, бо яны тут былі адгароджаныя як-бы «зялезнай заслонай», баючыся спатыкацца й гутарыць з намі. Але калі пападала ім у рукі беларуская газэта, дык хоць украдкам, каб не пабачылі свае «таварышы», яе чыталі й гэткім спосабам даведваліся праўды. Тут трэба выказаць вялікую падзяку ўсім рэдакцыям, выдавецтвам і грамадзкім арганізацыям у іншых краінах, якія безінтэрэсоўна прысылалі й прысылаюць свае газэты й часапісы, такім чынам памагаючы нам у грамадзкай працы.

Вытрывалая й ахвяраня праца ўправы ЗБА, асабліва ягонага старшыні сп. К. Мерляка, які займаў гэтае становішча на працягу пяці гадоў, як і цяперашняга старшыні сп. Ул. Другайца і ўсіх сяброў управы высока паднесла імя беларуса ў Аргентыне, здабыла нам вялікі давер аргентынскіх уладаў і ўсіх іншых нацыянальных арганізацыяў і прадстаўніцтваў, што ніводная імпрэза ці канфэрэнцыя міжнацыянальнага характару не адбываецца бяз удзелу беларусаў. Адным з найвялікшых дасягненьняў у рэпрэзэнтацыі навонкі былі дзьве прамовы сп. К. Мерляка ў гішпанскай мове: адна на антыкамуністычным мітынгу ў верасьні 1948 г., а другая на разьвітальным банкеце ў чэсьць былага грэцкага міністра ў 1949 г. Абедзьве гэтыя прамовы былі апублікаваныя ў аргентынскай прэсе. Дзякуючы стараньням управы ЗБА, было зьмешчана ў чужой прэсе Аргентыны звыш 32 артыкулаў аб беларусах і Беларусі.

Беларусы, згуртаваныя ў ЗБА, прарабілі вялікую нацыянальную работу, вынікі якой не прападуць ніколі, бо раз засеенае зерне ў падатную глебу будзе ўсьцяж расьці. Беларусы змаглі тут залажыць і разбудаваць сваю нацыянальную арганізацыю, ня маючы ніякае помачы ад сваіх суродзічаў, чаго не змаглі даканаць такія нацыянальнасьці, як баўгары, славенцы й чэхі, хоць апошнія знаходзяцца ў куды лепшым ад нас палажэньні.

Аднак гэта далёка ня ўсё. Можна было-б зрабіць шмат болей пры добрай волі й ахвоце навет пры ня шматколькаснай тут нашай эміграцыі. Адмоўна адбіваецца на нашай дзейнасьці адсутнасьць арганізацыі моладзі й тэатральна-артыстычных трупаў. Таму ў гэтым кірунку тут вельмі мала зроблена. Усяго адбыліся дагэтуль толькі два канцэрты, калі ня браць пад увагу канцэртных частак праграмаў розных урачыстых акадэміяў. А гэта ёсьць адзіная найлепшая дарога да душы старога беларускага эміграната, які, пачуўшы ў мастацкай форме сваё роднае слова й прыпомніўшы пры гэтым усё сваё роднае, што ён пакінуў у далёкай бацькаўшчыне, атросься-б ад чужых яму ўплываў, накінутых расейска-бальшавіцкай прапагандай, якая намагаецца да астатку затруць душу беларуса.

Цяпер кажны беларус, прачытаўшы гэты артыкул, можа дакладна здаць сабе справу з жыцьця й дзейнасьці беларусаў у Аргентыне за апошнія трыццаць гадоў. Можа вырабіць сабе ўяўленьне аб тым, як яны жылі, цярпелі й арганізаваліся, якія мелі перашкоды й труднасьці на шляху свайго існаваньня й нацыянальнай дзейнасьці.

Але ня гледзячы на ўсё гэта, беларусы ў Аргентыне, згуртаваныя ў ЗБА, зрабілі шмат і зробяць яшчэ болей; яны ніколі ня зрадзяць сваей маткі Беларусі, да апошняга будуць змагацца за сваё вольнае нацыянальнае жыцьцё на чужыне, а калі прыйдзе час, то й на бацькаўшчыне. Із духова здаровымі трэба йсьці заўсёды наперад да перамогі, не аглядаючыся на хворых, бо іх тут ужо ня вылячыш. Дык, беларусы Аргентыны, да жыцьця, да працы, да перамогі!

К. Мацкевіч

Буэнос-Айрэс, 14 верасьня 1951 г.

БЕЛАРУСЬ НЕПЕРАМОЖНАЯ

(Заканчэньне)

бясьсьледна цэлыя тысячы нацыянальна актыўных беларусаў, што знаходзіліся ў радох камуністычнай партыі.

Найбольш крывавым і бязьлітасным паходам шавіністычнай Масквы была масавая ліквідацыя «нацыянальных фашыстых» і «ворагаў народу» ў 1936—37 г.г. Гэта былі жахлівыя часы ежоўшчыны, якія пакінулі на Беларусі найбольш крывавыя сьляды. Увесь нацыянальна актыўны беларускі элемэнт, які яшчэ ўцалеў ад папярэдніх чыстак, быў цяпер бясьсьледна зьмецены зь беларускай зямлі й у бальшыні сваей зьнішчаны фізычна ў найбольш жахлівы спосаб. Падчас гэтае чысткі згінулі найбольш выдатныя беларускія гаспадарстваўскія дзеячы, як Чарвякоў, які змушаны быў даканаць самагубства, Галадзед, Стакун, Цішка Гартны, а так-жа папулярны ў народзе драматург і артысты Галубок і вялікае мноства іншых.

За чацьвёртую чыстку можна ўважаць расправу бальшавікоў над выдатнымі беларускімі нацыянальнымі й палітычнымі дзеячамі ў Заходняй Беларусі пасьля акупацыі *апошняй* Саветамі ў 1939 г. Адразу пасьля «вызваленьня адзінакроўных братоў» былі ў Вільні арыштаваныя выдатны беларускі палітык А. Луцкевіч, закладчык «Нашае Нівы» А. Уласаў, рэдактар «Крыніцы» Я. Пазьняк, пісьменьнік М. Косьцевіч, А. Трэпка, С. Бусел, У. Самойла й іншыя. А на працягу 1940 і першай палавіны 1941 г. адбыліся тры масавыя вывазы насельніцтва Беларусі ў аддаленыя акругі Савецкага Саюзу.

Пятая чыстка прыпадае на 1944—45 г.г. пасьля паўторнае акупацыі Беларусі бальшавікамі. Азьвярэлыя камуністычныя сатрапы выконваюць бязьлітасную помсту над беларускім народам за тое, што падчас апошняе вайны не хацеў ён бараніць Сталінскага рэжыму й праліваць кроў у інтарэсах свайго найлюцейшага ворага. Беларускаму народу кідаецца абвінавачваньне ў зрадзе радзімы», у выніку якога сотні тысячаў беларусаў гінуць у г. зв. «штрафных батальёнах» на фроньце або ссылаюцца ў канцэнтрацыйныя лягеры й на непасільную й галодную працу над адбудовай зьнішчаных вайною гарадоў і прадпрыемстваў. Наколькі жахлівым і безаглядным быў гэты новы паход імпэрыялістычнай Масквы, можа сьветчыць факт, што каля мільёна беларусаў, прымусова вывезеных на работы ў Нямеччыну, былі аб'яўленымі таксама «зраднікамі радзімы». Іх спатку той-жа самы лёс, што й беларусаў, якія падчас вайны асталіся на бацькаўшчыне.

Пасьля гэтых жорсткіх і крывавых распраў над нашым народам і фізычнага вынішчэньня цэлых мільёнаў найбольш перадавой і нацыянальна творчай ягонай часткі, Беларусь прадстаўляла сабой жахлівы абраз спусташэньня. Асталася на месцы толькі нацыянальна пасыўная, стэрарызаваная фізычна й маральна ды запалоханая маса, у значнай ступені перамешаная з насланым на Беларусь чужым, пераважна расейскім элемэнтам, заданьне якога было далейшэе саветызаваньне й русыфікаваньне беларускага народу. Спасярод інтэлігенцыі ўцалелі толькі тыя, якія не за сумленьне, але за страх стараліся быць вернымі русыфікатарскай палітыцы Масквы. Здавалася тады, што беларускае пытаньне ўжо раз назаўсёды разьвязанае, што беларускі нацыянальна-вызвольны рух ужо ня зможа болей адрадзіцца, што беларускі народ знаходзіцца напярэдадні нацыянальнае сьмерці.

Але гэта магло толькі так здавацца. Беларуская нацыянальная ідэя аказалася на столькі моцнай і арганічнай у беларускім народзе, беларуская нацыянальная стыхія аказалася вартасьцю непераможнай, якой фізычна зьнішчыць немагчыма. Бо вось прайшло пасьля апошняй масавай вынішчальнай акцыі расейскага бальшавізму ўсяго толькі некалькі год, як беларускі народ пачаў праяўляць ізноў сваю нацыянальную актыўнасьць. Беларуская інтэлігенцыя, а ў першую чаргу паэты й пісьменьнікі пачалі йзноў тварыць беларускія нацыянальныя вартасьці, ніяк ня могучы прытарнавацца да афіцыяльнай русыфікацыйнай лініі, срога вызначанай камуністычнай партыяй. Беларускае нацыянальнае жыцьцё пачало разьвівацца спантанічна, як неадлучная духовая канечнасьць беларускага народу.

Аб усім гэтым найлепей засьветчылі самі-ж бальшавікі. У вапошнія месяцы на Беларусі распачаўся новы паход Масквы супраць праяваў беларускага нацыяналізму, які зазначыўся ўва ўсіх галінах духовага жыцьця беларускага народу — у літаратуры, мастацтве, прэсе, навуцы й г.п. Чытачы «Бацькаўшчыны» мелі магчымасьць аб гэтым пераканацца, чытаючы выпіскі з цэнтральнай савецкай прэсы, якія падаюцца ў кажным думары нашае газэты ў вадзеле «На землях Беларусі». Там знаходзім дакумэнтальнае пацьверджаньне, што беларускі народ, ня гледзячы на ягонае сыстэматычнае вынішчэньне на працягу ўсяе бальшавіцкае акупацыі й жорсткае перасьледваньне ў вапошні мамэнт, не заламаўся, але астаўся нацыянальна здаровым і нацыянальна творчым. Таму Масква падняла новы алярм, што на Беларусі ўзрастае йзноў грозная небясьпека для праступных ейных мэтаў, што беларускі народ ня хоча прыняць накінутай яму тэрорам чужой камуністычнай сыстэмы, што ён адхіляецца ад прышчэпліванай яму ўсякімі спосабамі расейшчыны, што ён жадае жыць сваім собскім нацыянальным жыцьцём.

Пад адрасам беларускае інтэлігенцыі ставяцца сяньня камуністымі абвінавачаньні ў скрыўленьні ідэалягічнай ленінска-сталінскай лініі, у нацыянальнай абмежаванасьці й у буржуазным нацыяналізьме. Ключ да гэтых абвінавачаньняў знайсьці ня цяжка, бо яго-ж падае бальшавіцкая прэса. Абвінавачаньне ў «скрыўленьні лініі» адносіцца да ўсіх тых выпадкаў, калі беларусы, ня могучы пагадзіцца з чужой і варожай ім крэмлёўскай палітыкай, у розных галінах грамадзкага й культурнага жыцьця стараюцца рэалізаваць свой собскі кірунак, які адказвае патрэбам беларускага народу. «Нацыянальная абмежаванасьць», якая ставіцца ў закід беларусам, зьяўляецца ня чым іншым, як самаабаронай беларускага народу перад прымусовай русыфікацыяй, якая ў вапошні мамэнт дасягнула кульмінацыйнага пункту й зьяўляецца аснаўным мамэнтам «ленінска-сталінскай ідэалягічнай лініі». А закід «буржуазнага нацыяналізму» датычыць агульна ўсіх праяваў беларускага нацыянальнага жыцьця, якое маюць мужнасьць культываваць беларускія патрыёты, ня гледзячы на тое, што гэта зьяўляецца прызнаным за найвялікшы праступак. Усе гэтыя абвінавачаньні, якія ня сходзяць з балонаў савецкае прэсы й якім прысьвячаюцца пленарныя партыйныя, камсамольскія й прафэсыянальныя сходы, зьяўляюцца грознымі сымптомамі набліжэньня, гэтым разам ужо шостае генэральнае чысткі.

Бачым тады, што Беларусь зьяўляецца непераможным супрацьбальшавіцкім і супрацьрасейскім бастыёнам, аб які разьбіваюцца ўсе, навет найбольш вырафінаваныя намаганьні крывавых бальшавіцкіх катаў.

Дасюлешнія факты масавага фізычнага вынішчэньня беларускага народу й ягонай перадавой інтэлігенцыі зьяўляюцца для нас нязвычайна балючымі. Яны ў вялізарнай меры затрымалі натуральны нацыянальны развой беларускага народу й спрычыніліся да ягонага духовага абядненьня. Яны былі столькі балючым і нячуваным зьдзекам над беларускім народам, што ніякая сіла ня здолее іх вымазаць з народнае памяці. Але тое зьявішча, што, ня гледзячы на масавы крывавы тэрор і іншыя дэнацыяналізацыйныя мэтады, вынайдзеныя бальшавікамі, беларускі народ мае ў сабе столькі патэнцыяльнае духовае сілы, праяўляе столькі нацыянальнае жывучасьці й імкненьняў да выяўленьня роднай беларускасьці, зьяўляецца для нас моцна абнадзейваючым.

Яно ёсьць найлепшай зарукай таго, што і ўсякія далейшыя намаганьні расейскага бальшавізму поўнасьцю падпарадкаваць сабе непакорную Беларусь разаб'юцца аб непераможную нацыянальную стыхію беларускага народу. Яно сьветчыць найбольш вымоўна аб тым, што ў змаганьні за ператварэньне нашага краю ў правінцыю Расеі, а беларускага народу ў частку народу расейскага Беларусь астанецца непераможнай. Не дарма ў нашым нацыянальным гымне пяецца, што «не загіне край забраны, покі будуць людзі!»

Алесь Крыга

БЕЛАРУСЫ Й УКРАІНЦЫ ПРАТЭСТУЮЦЬ

У нядзелю 23 верасьня сёлета беларусы й украінцы ДП лягеру ў Бад Айблінгу наладзілі пратэстацыйны мітынг супраць стварэньня г.зв. Савету Вызваленьня Народаў Расеі й пасяганьняў апошняга на суверэнныя правы гэтых народаў. На мітынгі пасьля прамоваў прадстаўніка ўкраінцаў сп. М. Ільчука, які даў гістарычны нарыс расейскай імпэрыялістычнай палітыкі, і прадстаўніка беларусаў Др. Ст. Станкевіча, які насьвятліў нацыянальную праграму Савету Вызваленьня Народаў Расеі, супярэчнаю з нацыянальнымі інтарэсамі паняволеных бальшавізмам народаў, сход аднагалосна прыняў і падпісаў адпаведную Рэзалюцыю.

ДА УСІХ БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ

Набліжаецца дзень 27-га лістапада, дзень вялікага вайсковага здарэньня ў гісторыі змаганьня Беларускага Народу за сваю незалежнасьць. 27-га лістапада 1920 году у Случчыне верныя сыны нашага народу — беларускія вайскоўцы-патрыёты зарганізаваліся ў 12-тысячную брыгаду і збройна выступілі супроць бальшавіцкае навалы, што насоўвалася з усходу на нашу свабодную й незалежную Беларускую Народную Рэспубліку. Гэты гераічны чын Случчакоў перайшоў у нашую гісторыю, як чын вялікага патрыятызму, глыбокае любові да роднага краю і нязвычайнай ахвярнасьці ў змаганьні за свабодную й незалежную Беларусь. Таму кажны год уся беларуская грамадзкасьць, усе наншыя расьскінутыя па шырокім сьвеце арганізацыі й эміграцыйныя згуртаваньні ўрачыста сьвяткуюць гэты дзень, як Дзень Беларускіх Герояў, што зложылі найвялікшую ахвяру, сваё кіпучае жыцьцё, на аўтары змаганьня за шчасьце і свабоду дарагое Бацькаўшчыны. З самага характару гэтага Дня вынікае, што ёсьць ён у першую чаргу сьвятам беларускіх вайскоўцаў, для якіх слуцкія паўстанцы будуць вечна жывым прыкладам таго, які шлях вядзе да вызваленьня Бацькаўшчыны.

Гэтым зьвяртаюся да ўсіх беларускіх вайскоўцаў, вэтэранаў і камбатантаў, каб і ў гэтым годзе ўзялі ў свае рукі ініцыятыву ў варганізаваньні сьвяткаваньня 31-ых угодкаў Слуцкага Паўстаньня й, супольна з усім беларускім грамадзтвам, годна аддалі належную чэсьць памяці як паўшых на полі бітвы слуцкіх паўстанцаў, так і ўсіх тых, хто дзе-небудзь і калі-небудзь аддалі сваё жыцьцё за шчасьце і прыродныя правы Беларускага Народу, за вызваленьне нашае Бацькаўшчыны з-пад чужацкага панаваньня.

Вечная слава і чэсьць памяці тых, што памерлі, каб жыла Беларусь!

Ген. Фр. Кушэль
Старшыня Галоўнага Ураду Згуртаваньня Беларускіх Вэтэранаў на Чужыне

Нью-Ёрк, кастрычнік 1951 г.

ПРАЎНАЯ АПЕКА ЗН НАД УЦЕКАЧАМІ

Гэтымі днямі адкрылася ў Бон бюро камісара Задзіночаных Нацыяў дзеля праўнае апекі над уцекачамі не нямецкага паходжаньня. У хуткім часе такія-ж бюро маюць быць пакліканыя да жыцьця ў Аўстрыі, Італіі й Грэцыі.

ПРАДСТАЎНІЦТВЫ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:** Mr. Karas Leonid, 8, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:** **The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.**
3. **У Францыі:** Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du Ltn. Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У ЗША:** Mr. B. Danilovich, 222 Suydam St. New Brunsvick, N. J., U. S. A.
5. **У Канадзе:** Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:** Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:** Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street, East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:** Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:** Mr. Karanieuskj Marjan, Burns Izonsc Mosgiel, New Zeeland.

Непасрэдна з гэтых прадстаўніцтваў просім суродзічаў выпісваць «Бацькаўшчыну» і там-жа разьлічвацца за газэту.

ЦАНА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ

1. ЗША	15 цэнтаў
2. Канада	15 цэнтаў
3. Вялікабрытанія	1 шылінг
4. Францыя	40 франкаў
5. Аўстралія	1 шылінг
6. Аргентына	2 пэзо.
7. Бэльгія	5 франкаў

Ува усіх іншых краінах раўнавартасьць 15 цэнтаў ЗША за 1 эгзэмпляр.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў у Нямеччыне грошы за «Бацькаўшчыну» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на наступны адрас:

Mr. Jan Zaprudnik,
8, Place Hoover, Louvain, Belgique.

Артыкулы, падпісаныя прозьвішчамі або ініцыяламі аўтараў, могуць выражаць думкі, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.